## Заданні
## 6 клас

**Заданне 1.**
**Прачытайце словы ў адваротным парадку, запішыце іх.**
*Ажур, авал, альт, рог, соль, яр.*

**Заданне 2.**
**Устаўце прапушчаныя літары.**
*А..кцыён, д..візія, кал..ндар, Вольга ..ладзіміраўна, чэмпі..н, фі..лка, нацы..нальны, прэзіды..м, фашыс..кі, кват..рант.*

**Заданне 3.**
**Вызначце род назоўнікаў, падбярыце прыметнікі. Запішыце ўтвораныя словазлучэнні.**
*Жаль, боль, надпіс, тапол, вогнішча, гусь.*

**Заданне 4.**
**Замяніце выразы словазлучэннем "прыметнік +назоўнік".**
*Хустка бабулі, кніга суседкі, сшытак Івана, хатка бабра, ордэн дзядулі, малюнак дзяўчынкі.*

**Заданне 5.**
**Выпішыце словы з падоўжанымі зычнымі.**
*Разводдзе, суконны, аддаць, соллю, світанне, рассмяшыць, ралля, вуголле, будзённы, раззлаваць, Свіслаччу.*

**Заданне 6.**
**Запішыце лічбы словамі.**
*Каля 123 кг, у 549 скрынках, з 50 вучнямі, у 1945 годзе.*

**Заданне 7**
**Замяніце рускія выразы беларускімі адпаведнікамі.**
*Парное молоко –*
*Растительное масло –*
*Книжный магазин –*
*Гнездо аиста—*

**Заданне 8.**
**Складзіце сказы са словам *Орша*, каб яно ў адным выпадку было дзейнікам, у другім – зваротакам, у трэцім – дапаўненнем, у чацвёртым – акалічнасцю.**

**Заданне 9.**
**Вызначце жанр твораў, назавіце іх аўтара.**
*"Лебядзіны скіт"*
*"Сябры"*
*"Насцечка"*

**Заданне 10.**
**Назавіце імёны князёўны, дачкі князя Рагвалода.**

6 клас

1. Ружа, лава, тля, хор, лёс, рай.
( 0,5 б. за слова, макс. 3 б.)

2. Аўкцыён, дывізія, каляндар, Вольга Уладзіміраўна, чэмпіён, фіялка, нацыянальны, прэзідыум, фашысцкі, кватарант.
( 0,2 б. за слова, макс. 2 б.)

3. Жаль, боль, надпіс –м.р., таполя, гусь –ж.р., вогнішча – н.р.
( 0,5 б. за словазлучэнне, макс. – 3 б.)

4. Бабуліна хустка, суседчына кніга, Іванаў спытак, баброва хатка, дзядулеў ордэн, дзяўчынчын малюнак.
( 0,5 б.за словазлучэннс, макс. -3 б.)

5. Разводдзе, соллю, світанне, ралля, вуголле, Свіслаччу.
( 0,5б. за слова, макс. – 3 б.)

6. Каля ста дваццаці трох кілаграмаў, у пяцістах сарака дзевяці скрынках, з пяццюдзесяццю вучнямі, у тысяча дзевяцьсот сорак пятым годзе.
( 1 б. за правільна запісаны лічэбнік, макс. – 4 б.)

7. Сырадой, алей, кнігарня, буслянка.
( 1 б. за слова, макс. – 4 б.)

8. 1б. за сказ, макс. – 4 б.

9. "Лебядзіны скіт" –Ул.Караткевіч, (літаратурная) казка.
"Сябры" – Алена Васілевіч, апавяданне.
" Насцечка" – Кузьма Чорны, аповесць.
( 0, 5 б. за аўтара, 0,5 б. за жанр, макс. – 3 б.)

10. Рагнеда, Гарыслава, Анастасія .
( 1б. за імя, макс. – 3 б.)

Максімальная колькасць балаў -- 32